Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 37 (624) Пятніца, 17 снежня 1965 г. Год выдання XVIII Цана 1 кап.

# ПОСПЕХ, ТАВАРЫШЫ, У КАДРАХ

Усе бачаць, як бурна расце наш універсітэт. Павялічваецца колькасць студэнтаў, узрастае прафесарска-выкладчыцкі калектыў. Калі ў 1955 годзе ва універсітэце навучалася 5912 студэнтаў, то зараз удвая болей — 11825. Вучэбна-выхаваўчую работу на 10 факультэтах вядзе 654 выкладчыкі, з іх — 53 дактары навук і прафесары, 242 кандыдаты навук і дацэнты. Дзесяць год назад ва універсітэце працавала толькі 257 выкладчыкаў, сярод іх толькі 20 дактароў навук і прафесараў і 125 кандыдатаў навук і дацэнтаў.

У бліжэйшыя гады рост і пашырэнне універсітэта будзе ісці яшчэ больш бурнымі тэмпамі. У сувязі з гэтым востра паўстае пытанне падбору, расстаноўкі і выхавання кадраў. Менавіта, гэтай праблеме і быў прысвечан 15 снежня агульнаўніверсітэцкі партыйны сход. Намеснік сакратара партыйнага камітэта Т. Я. Дударава ў сваім дакладзе праінфарміравала камуністаў, як ідзе падрыхтоўка і ўкамплектаванне прафесарска-выкладчыцкага калектыву універсітэта.

Асноўнай крыніцай нашых кадраў з'яўляецца аспірантура. За апошнія гады кожны выпуск дае ёй 50—60 чалавек. Але бяда ў тым, што далёка не ўсе з іх абараняюць кандыдацкія дысертацыі. У сувязі з гэтым вельмі важнай задачай з'яўляецца паляпшэнне работы аспірантаў і з аспірантамі, каб кожны з іх абараняў дысертацыю ў адведзены тэрмін. Другой крыніцай росту кадраў з'яўляецца стварэнне ўмоў для выкладчыкаў, павышэнне патрабавальнасці да іх.

Паглыбленне выкладання навук, павышэнне работы сярод студэнтаў, адзначыла дакладчык, у многім залежыць ад работы педагагічнага калектыву, ад таго, як кожны вучоны адносіцца да сваёй адказнай і ганаровай справы, ад таго, як ён сябе паводзіць. Ва універсітэце ёсць нямала вучоных, якія вядуць работу на высокім навуковым і ідэйным узроўні, карыстаюцца сярод студэнтаў павагай і аўтарытэтам. Гэта прафесары Левашоў, Шнеярсон, дацэнты Цакуноў, Рабушка, Круцько, Прытыцкая і многія іншыя. Але побач з імі, на вялікі жаль, мы маем яшчэ факты амаральных паводзін і недобрасумленных адносін да сваіх абавязкаў. За плагіят і амаральныя паводзіны зволен з універсітэта выкладчык Пётух, за п'янства—дацэнт Базылеў, асістэнт Грак.

Многа ўвагі дакладчыца ўдзяліла задачам спалучэння вучэбнага працэсу з выхаваўчай работай. Як станоўчы прыклад, яна прывяла работу кафедр, якія ўзначальваюць тт. Лушчыцкі, Сікорскі і Круцько.

Актуальнасць праблемы, мэтанакіраваны даклад Г. Я. Дударавай выклікалі дзелавыя спрэчкі.

Прафесар Гахаў прапанаваў палепшыць індывідуальную работу сярод студэнтаў і лепшых з іх рэкамендаваць у аспірантуру.

Дацэнт Дулаў выказаў незадаволенасць з тае прычыны, што, нягледзячы на прынятыя рашэнні, да гэтага часу на юрыдычным факультэце няма лабараторыі па судовай псіхалогіі.

Змястоўным і дзелавым было выступленне намесніка дэкана філфака А. А. Волка. Каб палепшыць узровень падрыхтоўкі навуковых работнікаў, трэба смялей уцягваць іх у работу, даручаць ім распрацоўваць курсы лекцый і чытаць іх, праводзіць семінары. Толькі пры гэтай умове выпускнікі аспірантуры будуць гатовы да выкладчыцкай работы. Што датычыць паскарэння абароны дысертацый, то на нашым факультэце часта атрымліваецца затрымка ў абароне з-за адсутнасці публікацый, а надрукавацца па філалогіі вельмі цяжка. Патрэбна, каб універсітэт меў сваё выдавецтва.

У заключэнне спрэчак выступіў рэктар універсітэта, акадэмік А. Н. Сеўчанка. Ён падрабязна расказаў аб перспектывах далейшага росту універсітэта і заклікаў вучоных, выкладчыкаў павысіць патрабавальнасць да сябе і студэнтаў. Наша надзённая задача, сказаў прамоўца, дбаць не пра колькасць, а пра якасць падрыхтоўкі спецыялістаў для народнай гаспадаркі. Сурова крытыкаваў А. Н. Сеўчанка недастойныя паводзіны асобных выкладчыкаў і асабліва былога загадчыка кафедры В. А. Тамашэвіча. Адначасова А. Н. Сеўчанка выказаў упэўненасць у тым, што ў цэлым працаздольнаму, высокакваліфікаванаму, ідэйна вытрыманаму калектыву вучоных універсітэта пад сілу спраўдзіць усе адказныя задачы, што стаяць перад універсітэтам.

Па абмеркаванаму пытанню прынята рашэнне.



*— На семінарскіх занятках па гісторыі КПСС выступаю кожны раз,— гаворыць студэнт II курса юрыдычнага факультэта Сямён Скаруліс.— Інакш нельга: тут, як нідзе, можна праверыць, наколькі глыбока ведаеш першакрыніцы класікаў марксізма-ленінізма, гісторыю нашай Партыі і ўвогуле — сваю палітычную адукацыю.*

Фота І. Бакунова.

*НА ЗДЫМКУ: Студэнты ЛЕАНІД ЛАБКОЎСКІ і РАМАН МІХНЕВІЧ рыхтуюцца да чарговага заліку.*

*фота І. БАКУНОВА.*

## У ПАРТКОМЕ

## ПАГЛЫБЛЯЦЬ ВЫВУЧЭННЕ ГРАМАДСКІХ НАВУК

У барацьбе за перамогу камунізма ўсё больш магутным фактарам становіцца ідэалагічная работа, а, гэта значыць, і вывучэнне твораў класікаў марксізма-ленінізма, грамадскіх навук. Іх глыбокае веданне з'яўляецца першачарговым абавязкам усіх студэнтаў — будучых спецыялістаў, будаўнікоў камунізма.

Як жа праходзіць у нас вывучэнне грамадскіх дысцыплін? Партыйны камітэт нашага універсітэта стварыў спецыяльную камісію, якая на працягу лістапада гэтага года азнаямлялася, як авалодваюць грамадскімі навукамі студэнты фізічнага факультэта. Члены камісіі пабывалі на 7 лекцыях і 15 семінарах па гісторыі КПСС, філасофіі і палітычнай эканоміі, азнаёміліся з дакументамі факультэта, правялі асабістыя гутаркі з дзесяткамі студэнтаў.

Агульнае ўражанне камісіі— станоўчае. Яна лічыць, што студэнты фізічнага факультэта ў цэлым сур'ёзна адносяцца да грамадскіх навук, а выкладчыкі, лекцыі і семінары якіх наведалі члены камісіі, паказалі добрую спецыяльную падрыхтоўку і метадычнае ўменне.

Але поруч з гэтым праверка выявіла таксама і факты недаацэнкі некаторымі студэнтамі грамадскіх навук. Дэканат, кафедры і грамадскія арганізацыі ўсё яшчэ недастатковую ўвагу звяртаюць на стварэнне атмасферы павышанай цікаўнасці да першакрыніц. Так, у мінулым і бягучым годзе парторганізацыя, Вучоны Савет камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі ні разу спецыяльна не абмеркавалі пытанне аб становішчы і мерах па паляпшэнню вывучэння грамадскіх навук студэнтамі. Не прымаліся меры актыўнага ўздзеяння з боку грамадскіх арганізацый да тых студэнтаў, якія недаацэньваюць ролі грамадскіх навук, прапускаюць лекцыі і семінарскія заняткі. Гэта датычыцца асабліва студэнтаў вячэрняга аддзялення. Не арганізаван адпаведны кантроль і за самастойнай работай усіх студэнтаў. Лекцыі і семінары праходзяць часта суха, нецікава, дапускаецца лібералізм пры ацэнцы ведаў. Не ўсе выкладчыкі грамадскіх навук на лекцыях карыстаюцца наглядным дапаможнікамі, кінаскопамі і іншымі тэхнічнымі сродкамі. У групах і на курсах факультэта мала ўдзяляецца ўвагі пытанням выхавання студэнтаў на баявых рэвалюцыйных традыцыях, рэдка праводзяцца сустрэчы з ветэранамі вайны, старэйшым пакаленнем бальшавікоў, з перадавікамі зытворчасці, не арганізуюцца дыскусіі па асобных творах мастацтва.

Камісія выпрацавала адпаведныя прапановы па выкараненню заўважаных недахопаў. Як выяўленыя недагляды, так і чарговыя задачы па паглыбленаму засваенню грамадскіх навук вырашана шырока абмеркаваць на партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных сходах, на кафедрах грамадскіх навук з мэтай усямернага павышэння і ўдасканалення вывучэння ва універсітэце грамадскіх навук.

## ШТО?

**Партыйным камітэтам** нашага універсітэта была створана камісія па азнаямленню з работай студэнцкіх партыйных груп гістарычнага факультэта. Яна ўнесла прапанову аб неабходнасці стварэння самастойнай партыйнай групы гісторыкаў-аспірантаў.

Нядаўна адбыўся першы арганізацыйны сход аспірантаў-камуністаў.

Сакратаром групы аднагалосна абраны Я. Асіпенка.

## ДЗЕ?

Ужо стала традыцыяй хімікаў праводзіць у перад— экзаменацыйныя дні вечары адпачынку на факультэце. Канцэрт, танцы, вясёлыя гульні, атракцыёны — заўсёды садзейнічалі добраму настрою. Так было і на гэты раз. У суботні вечар выступілі студэнцкія спевакі, потым усе кружыліся ў вясёлым танцы.

— Пасля такога адпачынку і за экзамены лягчэй брацца, — гаварылі хімікі.

**Дэканат**, партбюро і камітэт камсамола філалагічнага факультэта арганізаваў шырокі паказ для студэнтаў серыі навукова-папулярных і дакументальных фільмаў. Некаторыя з іх студэнты паглядзелі. Гэта кінафільмы, прысвечаныя беларускаму першадрукару Ф. Скарыне, дзейнасці савецкіх кінарэжысёраў Эйзенштэйна і Даўжэнкі, а таксама народным пісьменнікам БССР Якубу Коласу і Янку Купалу.

## КАЛІ?

# НЕ СЕМ ДЗЁН — А ЎВЕСЬ ГОД

— Пакажы, Валодзя, раку Укаялі?

— А дзе знаходзіцца вулкан Чымбароса?

— Паўвостраў, які сам гаворыць, што ён маленькі?

Пытанні... пытанні... Яны сыплюцца, як з мяшка, не даюць апамятацца ні геаграфам, ні таму, хто да іх завітае. Гэта, каб лепш падрыхтавацца да сесіі, камсамольскае бюро факультэта праводзіць «тыдзень карты».

Веданне геаграфічнай карты вельмі важная частка падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. Яшчэ заснавальнік савецкай геаграфіі Н. Баранскі гаварыў, што карта — гэта альфа і амега геаграфіі. З карты пачынаецца яна як навука, картай і заканчваецца.

Вось чаму «тыдзень карты», які па традыцыі ўжо некалькі год запар праводзіцца на факультэце, ідзе паспяхова. У калідоры і аўдыторыях былі развешаны карты па фізічнай геаграфіі частак свету, па эканамічнай геаграфіі, па геалогіі карысных выкапняў і г. д. І так нават самы заядлы гультай натыкаўся на карты, раз-пораз паглядаў на іх, пападаў пад перакрыжны агонь пытанняў: Вулкан Бандой?.. Рака Шынгу?.. Ягмон?..

Разам з тым хочацца зрабіць заўвагу. Каб больш цікава і карысна праходзілі падобныя мерапрыемствы, камсамольскаму бюро патрэбна іх лепш прадумваць. Скажам, карты размясціць у нейкім парадку: асобна — карты па фізічнай геаграфіі, на іншай сцяне — па эканамічнай, па геалогіі.

Цяпер, калі да зімовай сесіі засталіся лічаныя дні, вельмі добра было б, каб камсамольскае бюро праявіла ініцыятыву і з дапамогай лабарантаў забяспечыла аўдыторыі найбольш неабходнымі картамі. І няхай «тыдзень карты» працягваецца на факультэце не сем дзён, а ўвесь навучальны год. Тады кожны студэнт смела пакрочыць на экзамен.

**П. КРЫВІЦКІ.**

# РАБІЦЬ НАСЦЕНГАЗЕТУ — ТРЭБА ЎМЕЦЬ

Гурт студэнтаў, гоман:

— Так яму і трэба, дачакаўся! Гаварылі: вучы, не слухаў... — Паглядзі, як яго двойка, нібы ведзьма, за шыю абкруціла. І цягачом не адарвеш!..

Студэнтаў збіраецца ўсё больш і больш, і хутка ўжо з-за галоў не відаць назвы толькі што вывешанага свежага нумару насценнай газеты...

За апошні час роля насценнага друку ў нашым універсітэце значна ўзрасла. Многія газеты сталі люстрам жыцця факультэтаў: тут і сатыра на гультаёў і абібокаў, вясёлы гумар, дзелавая размова пра вучобу, парады выкладчыкаў...

Але такія насценгазеты, як «Пражэктар», «Географ», «За навуку» і іншыя ўсё яшчэ слаба афармляюцца, матэрыялы часам тут параскіданы як папала, фотаздымкі — без падтэкстовак. Чытаючы іх, цяжка сканцэнтраваць увагу на галоўным.

Як лепш аформіць газету? Што патрэбна зрабіць для таго, каб яна лепш глядзелася? Гэтыя пытанні павінны хваляваць кожную рэдкалегію.

Нядаўна партком, камітэт камсамола, рэдкалегія газеты «Беларускі універсітэт» правялі семінар рэдактараў насценнага друку універсітэта. Шмат карыснага і цікавага расказаў ім аспірант П. Ткачоў, які многа год працаваў адказным сакратаром газеты «Піянер Беларусі».

— Афармленне, — гаварыў ён, — гэта твар газеты. Па ім ўжо можна меркаваць пра яе матэрыялы. Тут трэба быць свайго роду мастаком...

На канкрэтных прыкладах П. Ткачоў гаварыў аб добрым накірунку газеты «Гісторык» і «За Мічурынскую біялогію». Матэрыялы, загалоўкі, фотаілюстрацыя тут размешчаны мэтанакіравана, чаго якраз нехапае іншым газетам.

Многа слушных прапаноў таксама выказаў член парткома М. Чартко, члены рэдкалегій, рэдактары газет.

— Многае невядомае для мяне сёння стала зразумелым, наступны нумар будзе афармлен куды лепш, — прызнаваўся рэдактар «Географа» Н. Астаповіч.

**І. СМІРНОЎ.**

# НЕЗАБЫЎНАЯ СУСТРЭЧА

«...Для гэтай кнігі, свайму герою я аддаў многае з перажытага. А ўсё ж яна — «не аўтабіяграфія, а біяграфія адной душы», расказ пра яшчэ адзін шлях да святла, пра яшчэ адно месца ў страі яго абаронцаў».

Размову пра абмеркаванне кнігі «Птушкі і гнёзды» хочацца пачаць іменна гэтымі кранаючымі сэрца словамі, пачутымі ад самога пісьменніка. Не выпадкова пагаварыць аб яго творы сабралася шмат студэнтаў філалагічнага факультэта, тых, каго цікавіць наша сучасная літаратура. І трэба адразу сказаць — размова адбылася. Сапраўдная, шчырая!

Пра высокі гуманізм, чалавечнасць рамана «Птушкі і гнёзды» гавораць студэнт Канстанцін Сіневіч, лабарант А. М. Ляпіч.

Слова просіць студэнтка 5-га курса беларускага аддзялення Ліда Прашковіч:

— Лёс маці-Радзімы заўсёды непакоіць Алеся Руневіча — галоўнага героя рамана. Ён — частка яе, яе сын і абаронца. Да глыбіні душы мяне ўсхваляваў вобраз Алесевай маці. На маю думку, у яе вобразе аўтар увасабляе саму Радзіму.

Усхвалявана гаварыў Алег Цімінскі:

— Гэты ўдалы твор напісан вобразнай, паэтычнай мовай. Мова Брыля — вялікі скарб для чытача. Слова ў пісьменніка радуе, заварожвае... Прамоўца асprэчваў А. Шапялевіча, які сказаў, што кніга цяжка чытаецца.

— Побач з Алесем Руневічам, — гаворыць студэнт Сцяпан Ляўшук, — адчуваеш сябе дужэйшым, лепш разумееш жыццё, той час, які паказан у рамане.

І зноў выступленні, спрэчкі...

Цёпла сустрэты прысутнымі, выступіў Янка Брыль. Ён ад усяго сэрца падзякаваў за прынцыповае абмеркаванне рамана, расказаў пра гісторыю напісання «Птушак і гнёзд», кнігі, якая «напісана не па праву заслуг і пакут, а толькі па праву любасці да Чалавека — які ён ёсць, які ён будзе...»

У заключэнне прафесар М. Р. Ларчанка і дацэнт Д. Я. Бугаёў ад імя прысутных шчыра дзякавалі Янку Брылю. А студэнты паднеслі любімаму пісьменніку жмені жывых кветак.

**Ю. ГОЛУБ,**
**студэнт першага курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.**

*НА ЗДЫМКУ: студэнт гістарычнага факультэта Мікалай Гальчанюк тлумачыць сваім сябрам па вучобе і пакою студэнтам з С'ера-Леоне Джону Сіну і Самуэлю Рэнеру тэкст на рускай мове.*
Фота *А. Кадзета.*

# СВЕТЛАЙ ПАМЯЦІ А. І. ЛУР'Е

21-га снежня спаўняецца 70 гадоў з дня нараджэння прафесара Абрама Іосіфавіча Лур'е. Нарадзіўся ён у 1895 годзе, у горадзе Бабруйску ў сям'і служачага, вучыўся ў Кіеўскім універсітэце. У 1918 годзе Лур'е ўступае ў Камуністычную партыю і з таго часу ўсё сваё жыццё аддаў справе нашай партыі. Актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны, ён пасля яе сканчэння вёў плённую педагагічную і навуковую работу ў вышэйшых навучальных установах БССР. Апошнія 20 год свайго жыцця ён аддаў нашаму універсітэту.

Прафесар Лур'е быў арганізатарам і першым загадчыкам кафедры палітычнай эканоміі ў БДУ імя Ул. І. Леніна, якую ён узначальваў да апошніх дзён свайго жыцця.

Разам з тым вучоны вёў вялікую навуковую і грамадскую работу не толькі ва універсітэце, але і за яго сценамі, часта выступаў з дакладамі і лекцыямі па даручэнню партыйных органаў перад шырокімі масамі насельніцтва. За час сваёй дзейнасці ён падрыхтаваў шмат кваліфікаваных навуковых работнікаў-эканамістаў.. Яго палымяныя, змястоўныя лекцыі слухалі тысячы і тысячы студэнтаў вну, слухачоў партыйных устаноў рэспублікі.

Чалавек вялікай эрудыцыі і высокай культуры, ён быў і таленавітым і надзвычай добрым прапагандыстам марксісцка-ленінскай тэорыі. Глыбока прынцыповы, непрымірымы да ўсяго варожага і разам з тым душэўны чалавек, шчыры таварыш — такі быў прафесар А. І. Лур'е.

Памёр Абрам Іосіфавіч у росквіце сваіх творчых сіл 19 сакавіка 1948 года. Вобраз гэтага вучонага-камуніста застанецца для нас прыкладам самаадданай творчай працы на карысць савецкага народа.

**А. СКУМАН,**
**дацэнт кафедры палітэканоміі.**

# ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

**У № 34 «Беларускага універсітэта» паведамлялася, што газета не трапляе да чытачоў філалагічнага, біялагічнага, хімічнага факультэтаў.**

**Як нам паведамілі з камітэта камсамола універсітэта, пытанне было спецыяльна абмеркавана на пасяджэннях факультэцкіх бюро камсамола філфака, біяфака, хімфака. Выступленне газеты прызнана правільным.**

**Камітэт камсамола універсітэта назначыў адказных распаўсюджвальнікаў друку, якія будуць рэгулярна дастаўляць газету на факультэты.**

# СПРЭЧКА ІДЗЕ

# ДЫПЛОМ УРУЧАЦЬ — ДАСТОЙНЫМ

**Вядома, што усё выдатнае — высокаякаснае, а ўсё высокаякаснае зроблена выдатнымі, або, як кажуць, залатымі рукамі і з'явілася, як законны вынік сумленных адносін да працы. Кожнаму з вас, таварышы студэнты, у тым ліку і «троечніку», прыемна мець справы толькі з выдатным у жыцці. І кім бы ты ні працаваў, атрымаўшы дыплом інжынера, настаўніка ці кваліфікацыю іншага спецыяліста, ад цябе будуць патрабаваць выдатнай ці добрай і ў ніякім разе здавальняючай ці дрэннай работы. Таму мы павінны быць высокакваліфікаванымі спецыялістамі.**

**«Троечнік» ці «двоечнік» — гэта проста, як скула. Каб не хукаць на яе і каб не муляла яна, лепш яе з'аперыраваць.**

**На геаграфічным факультэце жыў быў, а правільней — капцеў студэнт Новікаў. Конкурсныя экзамены па прыёму ва універсітэт ён вытрымаў, але вучыцца не хацелася, яму, бачыце, нехапала цярпення сядзець на лекцыях, над падручнікамі. Затое ён цэлымі суткамі швэндаўся на праспекце, часцей за ўсё ў нецвярозым стане, абражаў прахожых, лаяўся на ўвесь свет. Новікаў заўсёды быў «хвастатым» пасрэднікам. Закончыў бы ён універсітэт, кваліфікаванай працы ад яго, вядома, не чакай. Зараз Новікаў справядліва адлучан ад непасільнага «цяжару»: ён выключан з універсітэта. На жаль, не адстаюць ад Новікава і некаторыя яго аднакурснікі — І. Ляскоўскі, А. Белая. І я думаю, што ўручыць ім дыплом — гэта будзе падманам грамадства.**

**У нас не павінна быць пасрэднікаў, сераднякоў, нічога пасрэднага і сярэдняга!..**

**М. ЧАРТКО,**
**член парткома.**

*(УЛАДЗІМІР ЗАСІНЕЦ, аспірант).*

**— Такія студэнты, як Віталій і Іван, сапраўды ёсць. І горш за ўсё, што яны раўнапраўныя з усімі намі ў агульнай студэнцкай сям'і: маюць інтэрнат, стыпендыю, ды яшчэ грамадскіх нагрузак ніякіх не цягнуць.**

**Думаю, што тройка па вядучых — вядома, не ацэнка. Але, калі студэнт спатыкнецца на другараднай дысцыпліне, то гэта яшчэ не так страшна.**

*(УЛАДЗІМІР МАЦЮШКОЎ, III-ці курс фізфак).*

**— Не перашкаджайце рыхтавацца! Мне не да вас: заўтра залік.**

Рэдактар А. ЛОЙКА.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, БДУ імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 1390. АТ 03585